УДК 37.017.4:378.184

Н.С. Шакун

# КАЛЕКТЫЎНЫЯ ТВОРЧЫЯ ПРЕКТЫ ЯК ІНСТРУМЕНТ ВЫХАВАЎЧЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Калектыўныя творчыя праекты ў вышэйшай школе заўсёды адыгрывалі надзвычай важную ролю ў выхаваўчым і адукацыйным працэсе. Іх асноўная мэта – раскрыццё індывідуальнага творчага патэнцыялу навучэнца і развіццё яго навыкаў эфектыўнага ўзаемадзеяння з іншымі ўдзельнікамі групы. Тэхналогія калектыўнай творчай дзейнасці дапамагае ўдзельнікам згуртавацца і пераадолець пэўныя магчымыя праблемы і бар’еры ў камунікацыі. Для таго, каб дасягнуць максімальнага пазітыўнага эфекту ад рэалізацыі калектыўнага творчага праекту, неабходна найперш загадзя распрацаваць яго план: сфармуляваць выхаваўчыя, адукацыйныя і практычныя мэты; скласці пакрокавую стратэгію рэалізацыі плану. Пажадана, паколькі гэта калектыўная творчасць, абмяркоўваць стратэгію і фармуляваць мэты і задачы разам з самімі ўдзельнікамі. Не пажадана навязваць мэты дырэктыўна. Але некаторыя выхаваўчыя задачы могуць вырашацца ў ходзе праекту незаўважна для саміх удзельнікаў і раскрывацца для іх у працэсе абмеркавання вынікаў калектыўнага творчага праекту.

Варта звярнуць увагу на адно з найбольш важных канцэптуальных адрозненняў творчых праектаў ад традыцыйных калектыўных заданняў – групавой працы, гутарак, паходаў на экскурсіі, у музеі: 1) па-першае, творчыя заданні не ідуць па строгім, у ходзе рэалізацыі праекту дазваляюцца пэўныя мадыфікацыі і адхіленні да рабочага плану ў залежнасці ад патрэбаў і магчымасцяў удзельнікаў праекту; 2) па-другое, на традыцыйных групавых заданнях навучэнцам транслюецца ўжо гатовы матэрыял, паведамляецца гатовая інфармацыя, мэты для іх адкрыты, а на творчых праектах ствараецца новы матэрыял, новая інфармацыя, якія ўзнікае ў ходзе рэалізацыі праекту.

На занятках беларускай мовы як мовы спецыяльнасці ў няпрофільных ВНУ мы можам рэалізаваць наступныя формы калектыўнай творчай дзейнасці: літаратурная лабараторыя, тэатральная творчая майстэрня, лінгвістычныя гульні і інш. У літаратурных лабараторыях прысвечаных тэматычна беларускай нацыянальнай культурнай спадчыне, фарміруецца патрыятычнае мысленне навучэнцаў, пачуццё гонару за нацыянальны культурны і літаратурны фонд, што развівае іх грамадзянскую самасвядомасць.